# СТАРАЖЫТНЫЯ ЛЮДЗІ, МАМАНТЫ І АРХЕОЛАГІ.

## ПАЛЕАЛІТЫЧНАЯ СТАЯНКА БЕРДЫЖ



СТАРАЖЫТНЫЯ ЛЮДЗІ, МАМАНТЫ І АРХЕОЛАГІ. ПАЛЕАЛІТЫЧНАЯ СТАЯНКА БЕРДЫЖ

**ПАЛЕАЛІТ** – СТАРАЖЫТНЫ КАМЕННЫ ВЕК, НАЙБОЛЬШ ПРАЦЯГЛЫ ЧАС У ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА.

З'явіліся **аўстралапітэкі** – чалавекападобныя малпы, якія перасоўваліся на дзвюх нагах.

З'явіліся самыя старажытныя людзі – **раннія Homo**.
Яны навучыліся рабіць простыя прылады з галькі.




**Першабытныя людзі** выйшлі за межы Афрыкі і **пачалі асвойваць Еўразію**. З'явіліся яны і ў Еўропе.
Ішлі тысячагоддзі. Адзін від Homo змяняўся на іншы, але ўсе выкарыстоўвалі аднолькавыя прылады – рубілы.

Дзесьці ў Афрыцы ўжо жылі продкі сучасных людзей – **сапіенсы**. А ў Еўропе пачалі панаваць **неандэртальцы**. Яны вынайшлі новыя прылады працы і добра прыстасаваліся да халоднага клімату.







ХТО САМЫ РАЗУМНЫ? АБ'ЁМЫ МОЗГУ

| АЎСТРАЛАПІТЭК | Homo erectus | НЕАНДЭРТАЛЕЦ | КРАМАНЬЁНЕЦ |
|---|---|---|---|
| 450 $cm^3$ | 700 $cm^3$ | 1500 $cm^3$ | 1400 $cm^3$ |

Дакладны час з'яўлення першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі пакуль загадка. Самыя старажытныя прылады працы знойдзеныя ў розных кутках нашай краіны: і на захадзе (у Агове), і на ўсходзе (Абідавічы і іншыя мясціны).







Ледавіковая эпоха скончылася. Скончыўся і палеаліт. Пачаўся **МЕЗАЛІТ** – сярэдні каменны век, час паляўнічых, збіральнікаў і рыбаловаў.

Ледавік паступова адыходзіў, і **на змену статкам мамантаў прыйшлі статкі паўночных аленяў.** Людзі змянілі свой лад жыцця і пачалі актыўна выкарыстоўваць лук і стрэлы.

Першыя пасяленцы краманьёнцаў на беларускіх землях – **Бердыж і Юравічы**. Іх даследуюць амаль сто гадоў, але ўсе таямніцы дагэтуль не былі высветленыя.

Па тэрыторыі Еўропы пачалі рассяляцца сапіенсы. Іх яшчэ называюць **краманьёнцы**. Яны неслі з сабой новыя тэхналогіі апрацоўкі каменя і косткі. Дзякуючы гэтаму маглі ўпаляваць нават маманта. Краманьёнцы ўмелі маляваць і любілі рабіць фігуркі людзей і жывёл. У хуткім часе пасля прыходу краманьёнцаў неандэртальцы вымерлі… Чаму – невядома.

**ДАРАГІ СЯБАР!**

Ты, канешне, любіш гуляць па вуліцах свайго горада ці вёскі, выбірацца на рэчку ці ў лес. І, напэўна, ты нават не здагадваешся, што крыху глыбей, пад зямлёй, ці проста пад тваімі нагамі могуць знаходзіцца рэчы, зробленыя людзьмі ў мінулым. Гэтыя прадметы шукаюць і вывучаюць навукоўцы – археолагі. Яны імкнуцца зразумець, як выглядала жыццё нашых далёкіх продкаў. Найбольш таямніц захоўвае пачатковы перыяд гісторыі – старажытны каменны век.

Кніга, якую ты трымаеш у руках, запрашае цябе ў незвычайнае падарожжа. Ты даведаешся, як працуюць археолагі. Ты пабываеш на раскопках паселішча Бердыж, заснаванага звыш 20 тысяч гадоў таму. Ты ўбачыш, як жылі людзі ў тыя халодныя і суровыя часы, калі на бязмежных абшарах панавалі маманты.

Цябе чакае шмат цікавых адкрыццяў, фактаў і заданняў. Археалагічныя прыгоды пачынаюцца!

# СТАРАЖЫТНЫЯ ЛЮДЗІ, МАМАНТЫ І АРХЕОЛАГІ.

## ПАЛЕАЛІТЫЧНАЯ СТАЯНКА БЕРДЫЖ



# ШТО ТАКОЕ АРХЕАЛОГІЯ





# ШТО ТАКОЕ АРХЕАЛОГІЯ І ХТО ТАКІ АРХЕОЛАГ?

У кожнага з нас ёсць мама. А ў нашай мамы таксама ёсць мама – наша бабуля. І ў нашай бабулі таксама ёсць мама – наша прабабуля. Мы ўсе маем продкаў! А адкуль мы ведаем, як яны жылі? Якую ежу елі, якім посудам карысталіся, якое адзенне насілі? Вядома, можна запытацца ў мамы ці бабулі. Але паразмаўляць з прабабуляй ужо не атрымаецца... А цяпер задайце сабе пытанне, адкуль жа нам даведацца, як людзі жылі ў Беларусі 500 гадоў таму? А 1 500, а 15 000? Асабліва, калі людзі не пакінулі ніякіх пісьмовых запісаў пра сваё жыццё...
Археолагі імкнуцца высветліць, якім было жыццё чалавека ў даўнія часы, і таму вывучаюць **артэфакты** – прадметы, створаныя людзьмі, і **помнікі** – месцы, дзе людзі жылі ці хавалі памерлых, ці пакланяліся баствам, у якіх верылі...




Адзін са спосабаў даведацца – звярнуцца да такой навукі, як археалогія




## Прыгоды археолага




Праца археолага падобна да працы дэтэктыва. І той, і другі шукаюць сляды падзей, якія некалі адбыліся. Але ёсць і адрозненні. Дэтэктыў аднаўляе карціну злачынства, а археолаг знаходзіць адказы на самыя разнастайныя пытанні, напрыклад: чым займаліся старажытныя людзі? Як яны здабывалі сабе ежу? Як апраналіся? І якім чынам будавалі свае дамы?

Даследаванне мінулага – справа нялёгкая. Археолагі праводзяць шмат часу ў экспедыцыях. Пасля завяршэння раскопак спецыялісты вывучаюць знойдзеныя рэчы ў лабараторыі.

Археолаг – чалавек з добрай адукацыяй, які не стамляецца набываць новыя веды. Ён цудоўна арыентуецца на мясцовасці і выдатна валодае мноствам складаных камп'ютарных праграм. Ён не баіцца цяжкасцяў і ведае, што галоўнае адкрыццё – наперадзе!

## Археолаг...




Калі ты хочаш стаць археолагам, то вучыся добра. Не прапускай урокі гісторыі, геаграфіі, фізікі, хіміі. І не забудзь пра мовы – родную і замежныя!



# ШТО ТАКОЕ АРХЕАЛАГІЧНЫ ПОМНІК?

**Археалагічны помнік** – гэта любое месца, дзе захаваліся старыя рэчы і рэшткі збудаванняў. Навукоўцаў цікавяць і помнікі, якія чалавек пакінуў тысячы год таму, і помнікі, якія ўзніклі ў XX стагоддзі.

На тэрыторыі Беларусі вядомы тысячы археалагічных помнікаў розных часоў, аднак штогод даследчыкі знаходзяць новыя. Археолагам важна зразумець, які помнік яны знайшлі. Часам гэта бывае няпроста.












## ЗНАЙДЗІ АРХЕАЛАГІЧНЫЯ АРТЭФАКТЫ

Часам кроцікі, рыючы свае хады, шкодзяць помнікам.

Паспрабуй знайсці, у якім месцы знаходзяцца археалагічныя артэфакты і падумай, які археалагічны помнік пашкодзіў наш кроцік!

што шукаць



# ШТО ТАКОЕ КУЛЬТУРНЫ СЛОЙ І ЯК ЁН УТВАРАЕЦЦА?

**Культурны слой** – гэта напластаванні зямлі, якія ўтварыліся ў выніку чалавечай дзейнасці. Звычайна культурны слой насычаны шматлікімі знаходкамі. Ён можа ўключаць прылады працы, кераміку і іншыя прадметы побыту, рэшткі жылых і гаспадарчых пабудоў.










Культурны слой утвараўся паступова. Яго памер залежыць галоўным чынам ад таго, наколькі доўга людзі жылі на пэўнай тэрыторыі і наколькі актыўна займаліся рознымі гаспадарчымі справамі.
Культурны слой горада будзе больш магутным, чым культурны слой маленькай вёсачкі.






**СТРАТЫГРАФІЯ** – у археалогіі так называецца парадак чаргавання пластоў са слядамі чалавечага жыцця. Ведаючы паслядоўнасць залягання пластоў, археолагі могуць датаваць знаходкі.






# ЖЫЦЦЁ СТАРАЖЫТНЫХ ЛЮДЗЕЙ





# ЛЮДЗІ, АЛЕ ІНШЫЯ...

У перыяд 130–40/35 тыс. гг. таму сапраўднымі валадарамі еўрапейскіх абшараў былі **неандэртальцы**. Адрозніваліся ад нас зусім нязначна. Былі невысокага росту з кароткімі рукамі і нагамі. Шмат важылі. Мелі вялікую галаву, вялікі мозг (большы, чым у сучасных людзей), а таксама шырокі твар з шырокім і пляскатым носам.

Менавіта такая будова цела дапамагала неандэртальцам прыстасоўвацца да вельмі халоднага клімату.




## ЖЫЦЦЁ НЕАНДЭРТАЛЬЦАЎ

ЖЫЛІ НЕВЯЛІКІМІ ГРУПАМІ, ЯКІЯ НАЛІЧВАЛІ НЕКАЛЬКІ ДЗЯСЯТКАЎ ЧАЛАВЕК. ЗАЗВЫЧАЙ, НЕАНДЭРТАЛЬЦЫ АБЖЫВАЛІ ПЯЧОРЫ.



НЕАНДЭРТАЛЬЦЫ КАРЫСТАЛІСЯ ШМАТЛІКІМІ КРАМЯНЁВЫМІ ВЫРАБАМІ. ІХ АСНОЎНАЙ ПРЫЛАДАЙ ПРАЦЫ БЫЎ ВОСТРАКАНЕЧНІК. ТРОХВУГОЛЬНАЕ ВАСТРЫЁ МАЦАВАЛІ ДА ДРЭЎКА З ДАПАМОГАЙ СПЕЦЫЯЛЬНАГА КЛЕЮ, ЯКІ ВАРЫЛІ З БЯРОЗАВАЙ КАРЫ.






ГАЛОЎНЫМ ЗАНЯТКАМ НЕАНДЭРТАЛЬЦАЎ БЫЛО ПАЛЯВАННЕ. ЯНЫ МАГЛІ ЎПАЛЯВАЦЬ ТЫСЯЧАКІЛАГРАМОВЫХ ЖЫВЁЛІН: НАСАРОГА, АЛЕНЯ, БІЗОНА. ВЕЛЬМІ ЛЮБІЛІ ЕСЦІ МЯСА. ТАКСАМА СПАЖЫВАЛІ РАСЛІНЫ, ГРЫБЫ І НАВАТ РЫБУ. ЧАС АД ЧАСУ ЕЖУ ГАТАВАЛІ НА АГНІ.

Часам неандэртальцаў лічаць дзікунамі і не вельмі разумнымі істотамі, але гэта няправільна!
Яны клапаціліся пра сваіх суродзічаў: лячылі хворых і хавалі памерлых. Навучыліся рабіць наскальныя малюнкі. Упрыгожвалі сябе прасвідраванымі ракавінкамі.
У сваіх пячорах рабілі схованкі і туды змяшчалі чарапы пячорных мядзведзяў або бізонаў – магчыма, каб ім пакланяцца. Дагэтуль, аднак, невядома, ці ўмелі неандэртальцы размаўляць.




А ЯШЧЭ Я ЎМЕЮ ПРЫГОЖА ВЫСЯКАЦЬ НА СКАЛАХ РОЗНЫЯ МАЛЮНКІ!




Я ХАВАЮ ЧАРАПЫ ЖЫВЁЛ У ПЯЧОРАХ, БО ЯНЫ ДЛЯ МЯНЕ – СВОЕАСАБЛІВЫЯ ІСТОТЫ!







Я ЛЮБЛЮ ПРЫГОЖЫЯ РЭЧЫ, ЗРОБЛЕНЫЯ СВАІМІ РУКАМІ.




І ўсё было добра, пакуль з далёкай Афрыкі не прыйшлі **сапіенсы (альбо краманьёнцы)** – першыя прадстаўнікі сучаснага чалавецтва. Усяго за некалькі тысяч гадоў яны асвоілі новыя землі, а неандэртальцы вымерлі. Ніхто не ведае, чаму неандэртальцам так не пашанцавала.

Сёння на нашых вуліцах неандэртальцаў не сустрэнеш. Але кожны еўрапеец мае каля 2% неандэртальскіх генаў. Навукоўцы мяркуюць, што гэтыя гены дапамагаюць арганізму чалавека лепш абараняцца ад розных бактэрый.

# ЦІ БЫЛІ НЕАНДЭРТАЛЬЦЫ Ў БЕЛАРУСІ?

Кожная новая археалагічная знаходка паглыбляе нашыя веды пра жыццё далёкіх продкаў. Некаторыя артэфакты нават дазваляюць пераглядзець звыклыя ўяўленні пра мінулае.






# ПРЫГОДЫ САПІЕНСАЎ У ЕЎРОПЕ ПАЧЫНАЮЦЦА

Самыя першыя **сапіенсы (краманьёнцы)** з'явіліся на тэрыторыі Еўропы каля 50 тыс. гг. таму. Яшчэ праз дзесяць тысячагоддзяў яны сталі сапраўднымі гаспадарамі новых прастораў і рассяліліся на землях ад Іспаніі да Паволжа.

Жыццё нашых далёкіх продкаў нельга было назваць простым. Перад вачыма мігрантаў з цёплых земляў паўсталі незвычайныя краявіды. Паўсюль раслі імхі, лішайнікі, карлікавыя бярозы. Навокал блукалі маманты, зубры, аўцабыкі, шарсцістыя насарогі...






Яны пачалі шыць адзенне са скуры і нават упрыгожвалі яе пацеркамі з біўня маманта.

Людзі сталі распісваць сцены пячор каляровымі выявамі жывёл. У якасці фарбы выкарыстоўваліся вохра і вугаль, змешаныя з тлушчам.

Людзі ў пячорах не жылі, а толькі час ад часу іх наведвалі. Хутчэй за ўсё, яны збіраліся ў такіх незвычайных месцах, каб здзяйсняць магічныя рытуалы.




Але кемлівасці ў старажытных людзей было з лішкам.

Яны вынайшлі новую тэхніку апрацоўкі крэменю і навучыліся сколваць доўгія вузкія пласцінкі. З такіх нарыхтовак можна было рабіць самыя разнастайныя прылады працы. Сапіенсы сталі майстраваць касцяныя наканечнікі для коп'яў. Такая зброя добра падыходзіла для палявання на бізонаў, дзікіх коней, паўночных аленяў.

Адны з самых старажытных наскальных малюнкаў знойдзены ў пячоры Шавэ ў Францыі.



# НАПЕРАД, НА АСВАЕННЕ НОВЫХ ЗЯМЕЛЬ

Каля 30 тыс. гг. сапраўдным цэнтрам тагачаснай цывілізацыі стала Падунаўе. Гэты абшар прыйшоўся даспадобы старажытным людзям.







ЧАСАМ Я МАГУ ЎПАЛЯВАЦЬ БІЗОНА. ГЛЯДЗІ, ЯКІ ЁН ДУЖЫ!



ТРАПЛЯЮЦЦА І СТАТКІ ПАЎНОЧНЫХ АЛЕНЯЎ. ІХ ЦЯЖКА ЎПАЛЯВАЦЬ, БО ЯНЫ ХУТКА БЕГАЮЦЬ.



Я ЎПАЛЯВАЎ ТАКОГА ЗВЕРА – ШАРСЦІСТАГА НАСАРОГА. Я БЫЎ ВЕЛЬМІ ШЧАСЛІВЫ І СЫТЫ!



І КАНЕШНЕ Ж, ДЗІКІЯ КОНІ! ЗА ІМІ СКЛАДАНА ЎСАЧЫЦЬ, ВЕЛЬМІ ЖВАВЫЯ ЖЫВЁЛЫ, АЛЕ Я ЗДАБЫЎ АДНАГО ЎЧОРА!



А ВОСЬ ГЭТЫ ЗВЕР – МАЯ МАРА. ГЭТА МАМАНТ. КАЛІ-НЕБУДЗЬ Я ЯГО АБАВЯЗКОВА ЎПАЛЮЮ!




Людзі эпохі палеаліту будавалі з костак жывёл круглыя і авальныя хацінкі даўжынёй 6-7 м. Унутры раскладалі вогнішчы і побач з імі займаліся хатнімі справамі.
КАРАЛІ З ІКЛАЎ
ПАДВЕСКІ З КАМЕНЮ
ФЛЕЙТА
ЖАНОЧАЯ ГАЛАВА З БІЎНЯ МАМАНТА
З крэменю рабілі прылады працы і зброю, з костак, зубоў і біўняў – упрыгажэнні і флейты.
Людзі навучыліся скручваць вяроўкі, плесці кошыкі, дыванкі, сеткі, а таксама засвоілі прымітыўнае ткацтва.
Адно жытло было незвычайным: унутры знаходзілася зробленая з гліны печ. Гэта была самая старажытная ў свеце майстэрня для вырабу керамічных статуэтак!
Майстры змешвалі гліну з тоўчанай косткай, ляпілі фігуркі жанчын і звяроў, а пасля абпальвалі ў печы.
Я – ГЛІНЯНЫ МЯДЗВЕДЗЬ. МЯНЕ ЗЛЯПІЎ СТАРАЖЫТНЫ ЧАЛАВЕК І АБПАЛІЎ У ГЭТАЙ ПЕЧЫ, КАБ Я НЕ ЗЛАМАЎСЯ!
Прастора побач з хацінкамі была проста завалена парэшткамі мамантаў.
Хутчэй за ўсё, людзі жылі на паселішчы непрацяглы час і толькі перыядычна збіраліся разам, каб правесці сумеснае паляванне або зладзіць свята. Тады ў адным месцы маглі сабрацца каля ста чалавек!
Адны вучоныя думаюць, што старажытныя паляўнічыя былі міралюбівыя.
Я – САБАКА. ВЕРАГОДНА, МЯНЕ ПРЫРУЧЫЎ ЧАЛАВЕК МНОГА ТЫСЯЧ ГАДОЎ ТАМУ. АЛЕ ВУЧОНЫЯ СПРАЧАЮЦЦА!
Другія вучоныя сцвярджаюць, што першабытныя людзі былі вельмі жорсткія і ваяўнічыя.
Ніхто не ведае, ў якіх багоў яны верылі і якім духам прыносілі дары.
Вядома толькі тое, што яны хавалі сваіх памерлых суродзічаў.

## НЕЗВЫЧАЙНАЕ ПАХАВАННЕ

Аднойчы археолагі адкрылі магілу, у якой ляжалі тры шкілеты. Нават дасведчаныя навукоўцы былі ўражаныя.

Шмат тысяч гадоў таму першабытныя паляўнічыя пахавалі ў неглыбокай яме трох маладых братоў. Ім было ад 16 да 25 гадоў. У двух старэйшых братоў на лбах меліся вялікія шрамы – сведчанні некалі перанесеных траўмаў. Трэці брат, самы малодшы, пакутаваў на рэдкую і цяжкую хваробу костак. Усе юнакі насілі на галовах ўпрыгажэнні з прасвідраваных зубоў драпежнікаў і падвескі з біўня мамантa.

Калі яны памерлі, спачатку ў магілу паклалі цела малодшага брата. Галаву і жывот засыпалі чырвонай вохрай. Потым побач змясцілі парэшткі старэйшых братоў. Іх галовы, нібы маскай, закрылі тоўстым слоем вохры. Зверху на памерлых накідалі галінкі і абпаленыя дошкі.

Кім жа былі гэтыя маладыя людзі і што з імі здарылася? Можа быць, хворы юнак успрымаўся як чалавек, у якога ўвайшлі добрыя ці злыя духі. Пасля яго смерці, падчас пахавальных абрадаў, старэйшыя браты былі прынесеныя ў ахвяру. Магчыма, родзічы загінулі падчас эпідэміі. Не выключаецца і тое, што ўсе яны былі забітыя...

Аднак прайшоў час, і падрабязнасці трагедыі сцёрліся з памяці нашчадкаў.



## МІГРАЦЫЯ ВА ЎСХОДНЮЮ ЕЎРОПУ

Жыццё было размераным і зразумелым. Аднак ішоў час, і клімат паступова мяняўся. На цэнтральную частку Еўропы насоўваўся ледавік, і нават мамантам станавілася холадна і галадна.

Людзі былі вымушаны пакінуць абжытыя мясціны і вырушыць у дарогу. Яны ішлі ў розных кірунках. Некаторыя групы з цягам часу дайшлі да ўзбярэжжаў Дняпра, Дона, Акі.






# ЖЫЦЦЁ ПАЛЯЎНІЧЫХ НА МАМАНТАЎ



Вандроўнікі з Падунаўя прыйшлі на тэрыторыю Усходняй Еўропы каля 25 тыс. гадоў таму. Іх не палохала суворая прырода. Яны мелі ўсё неабходнае, каб забяспечыць сабе камфортнае жыццё. На працягу наступных больш чым дзесяці тысячагоддзяў асновай дабрабыту людзей быў мамант.

У Бердыжы былі знойдзены адзінкавыя косткі розных жывёлін ледавіковага перыяду, а яшчэ – каля 2000 костак мамантаў, якія паходзілі прыкладна ад 50 асобін. І гэта не рэкорд. На некаторых іншых усходнееўрапейскіх паселішчах археолагі сабралі парэшткі, што засталіся больш чым ад 100 мамантаў!




## ЯК ЗБУДАВАЦЬ ДОМ З КОСТАК МАМАНТАЎ?



Адзіным будаўнічым матэрыялам, даступным першабытным людзям, былі косткі.

Цяжкасці не перашкаджалі старажытным будаўнікам узводзіць сапраўдныя архітэктурныя шэдэўры. На будаўніцтва аднаго дома ішлі парэшткі некалькіх дзясяткаў мамантаў.



Самая старажытная пабудова, якой больш за 20 тысяч гадоў, знойдзена ў Касцёнках пад Варонежам.

Яна нагадвала аднапавярховы шматкватэрны дом. Некалькі жытлаў, размешчаных побач, утваралі авал даўжынёй больш за 30 м і шырынёй каля 8 м.




Дах быў зроблены з біўняў. 1

Аснову канструкцыі ўтваралі чарапы і косткі мамантаў. 2

Пабудова ацяплялася гарачым косткавым вугалем, рассыпаным па падлозе. 3

Па цэнтральнай лініі мясцілася 10 вогнішчаў шырынёй каля 1 м. У вогнішчах палілі косткі мамантаў. 4

Побач з пабудовай знаходзіліся вялікія і маленькія ямы. Маленькія ямкі выконвалі ролю шафаў. У некаторых знаходзіліся касцяныя прылады працы, у некаторых – фігуркі звяроў ці жаночыя статуэткі. 5

Вялікія ямы былі сховішчамі. Яны мелі перакрыцці з костак мамантаў, там захоўваліся кавалкі мяса, запасы сыравіны і будаўнічых матэрыялаў. 6




## ЦІ ЎЗВОДЗІЛІ ДАМЫ ЖЫХАРЫ БЕРДЫЖСКАЙ СТАЯНКІ?



## СМАЧНА ЕСЦІ!

Археолагі падлічылі, што для таго, каб добра накарміць групу з 50 чалавек, патрабавалася каля 175–230 кг мяса мамантаў у дзень. За год супольнасць магла з'есці 36–45 мамантаў.








## МОДА КАМЕННАГА ВЕКУ









## ЯКІЯ ВЫРАБЫ ЗНОЙДЗЕНЫ Ў БЕРДЫЖЫ?



# ПРА ШТО РАСКАЗВАЮЦЬ КРАМЯНЁВЫЯ ЗНАХОДКІ






# ПРЫГАЖОСЦЬ, ЯКОЙ БОЛЬШ ЗА 20 ТЫСЯЧ ГАДОЎ













Для чаго старажытны чалавек ствараў фігуркі людзей і жывёл, вучоныя могуць толькі здагадвацца. Хутчэй за ўсё, мяркуюць яны, прадметы мелі магічнае ці рытуальнае значэнне.

Вядуцца спрэчкі і наконт арнаментаваных рэчаў штодзённага ўжытку. Можа быць, уладальнікі хацелі паказаць, што яны з'яўляліся важнымі асобамі ў грамадстве? Пра гэта мы ніколі не даведаемся...

Усходнееўрапейскія прасторы сустрэлі адважных паляўнічых суровымі, але маляўнічымі пейзажамі. прыпалярная тундра - так па-навуковаму называюцца падобныя мясціны.

Было холадна, асабліва зімой. Часта дзьмуў пранізлівы вецер. Цёплае лета вельмі хутка заканчвалася, і наступала сонечная восень амаль без дажджоў.

Трава, якая паспявала вырасці за кароткія гарачыя дзянькі, высыхала. Надыходзіла чарговая зіма, аднак снегу выпадала мала, і дзе-нідзе з-пад белага покрыва выглядвалі сухія купкі раслін.

Гэта былі ідэальныя ўмовы для жыцця шарсцістых насарогаў, дзікіх коней, бізонаў, паўночных аленяў, пясцоў. Але сапраўдным валадаром прыледавіковай пустыні быў мамант.




Першыя маманты з'явіліся каля 5 млн. гадоў таму ў Афрыцы.
РАДЗІМА МАМАНТАЎ
АФРЫКА
Першыя жыхары тэрыторыі Беларусі бачылі апошняга прадстаўніка роду – шарсцістага маманта.
ШАРСЦІСТЫ МАМАНТ
У розныя часы на планеце жылі розныя віды гэтых слановых.
ВІДЫ МАМАНТАЎ
400 cm
300 cm
200 cm
ПАЎДНЁВЫ МАМАНТ
СТЭПАВЫ МАМАНТ
МАМАНТ КАЛУМБА
КАРЛІКАВЫ МАМАНТ
ШАРСЦІСТЫ МАМАНТ


Шарсцістыя маманты былі добра прыстасаваныя да надзвычайных маразоў. Жывёлы мелі тоўстую праслойку тлушчу і былі пакрытыя грубай поўсцю.
Я ЖЫЎ 60-80 ГАДОЎ!
МАЯ ВЫШЫНЯ – ДА 350 cm
ПОЎСЦЬ МАЯ – ДА 120 cm У ДАЎЖЫНЮ
МОЙ БІВЕНЬ МОЖА БЫЦЬ ДАЎЖЭЙШЫ ЗА 420 cm
ВАЖУ Я ДА 8000 КГ
У іх было ўсяго 6 зубоў: 4 жавальныя зубы і 2 біўні. Жавальныя зубы нагадвалі тарку для пераціранне расліннасці. Калі яны моцна сціраліся, на змену вырасталі новыя. У маманта зубы мяняліся некалькі разоў за жыццё!
ЗУБ ЖАВАЛЬНЫ 4 ШТ.
ЗУБЫ НА ЗМЕНУ
БІВЕНЬ 2 ШТ.
КОРАНЬ
ЖАВАЛЬНАЯ ПАВЕРХНЯ

Маманты харчаваліся травой, якую лёгка знаходзілі нават зімой пад снегам. Пры нагодзе ласаваліся лістамі і галінкамі дрэваў. У дзень дарослы мамант мог з'есці каля 200-300 кг ежы.

Час ад часу жывёліны адчувалі патрэбу ў мінералах: натрыі, каліі, кальцыі. Гэтыя харчовыя дадаткі ўтрымліваліся ў глiністых адкладах на берагах рэк. Маманты часта наведвалі такія радовішчы.



Хутчэй за ўсё, мяркуюць навукоўцы, лад жыцця мамантаў нагадваў лад жыцця сланоў. Яны існавалі невялікімі групамі.



Асобны статак утваралі маманціхі і маманцяняты. У склад такой сямейнай групы магло ўваходзіць больш за 30 жывёлін. Сваім статкам збіраліся дарослыя маманты. Самыя дужыя маманты жылі паасобку.




## МЕСЦЫ, ДЗЕ ЗНОЙДЗЕНЫ ПАРЭШТКІ МАМАНТА



# ЗАМАЦОЎВАЕМ ВЕДЫ





СТАРТ
ДАПАМАЖЫ МНЕ, САПІЕНСУ, ДАБРАЦЦА ДА ЕЎРАЗІІ!
ФІНІШ

## ЗЛУЧЫ ЛІЧБЫ ПА ПАРАДКУ!




## ЗЛУЧЫ ЛІЧБЫ ПА ПАРАДКУ!



## ПАДПІШЫ НАСКАЛЬНЫЯ ВЫЯВЫ



## РАЗМАЛЮЙ ПА ЛІЧБАХ



## ЗНАЙДЗІ СЛОВЫ

ДЫЯДЭМА
ПАЦЕРКА
БРАНЗАЛЕТ
ЛАПАТКА
ЗУБ
ПЯСЕЦ
БІВЕНЬ
АРНАМЕНТ
ВЕНЕРА
СТАТУЭТКА

Шукай і па вертыкалі,
і па гарызанталі






## ЗНАЙДЗІ СЛОВЫ

БЕРДЫЖ
МАМАНТ
ПАЛЯВАННЕ
САПІЕНС
КРАМАНЬЁНЕЦ
КРЭМЕНЬ
ПАЛЕАЛІТ
КАРАЛІ
КОСТКІ
ЛЕДАВІК

Шукай і па вертыкалі,
і па гарызанталі



## ЗНАЙДЗІ ПРАДМЕТЫ



Ці памятаеш ты, як яны называюцца?
**Напішы адказы у акенцы.**








## СКЛЕЙ МАМАНТА

Табе спатрэбяцца:
нажніцы
клей

Папрасі дапамогі ў бацькоў!





**Вось і заканчваецца тваё падарожжа.**

Археалагічныя даследаванні, аднак, працягваюцца. Штогод навукоўцы знаходзяць новыя помнікі і разгадваюць чарговыя загадкі мінулага. І, можа быць, аднойчы і ты захочаш пачаць свой шлях у археалогію.



# Археалагічныя помнікі каменнага веку з кнігі

